У 2011 дзіцячы сад-яслі, сярэдняя і маст. школы, Дом культуры, б-ка, амбулаторыя, комплексны прыёмны пункт, аддз. сувязі і «Беларусбанка», 2 магазіны, сталовая; Пакроўская царква (2006). Магіла сав. воінаў, помнік землякам, якія загінулі ў Вял. Айч. вайну.

**ВЯСЁЛЫ** Касьян (сапр. А ў д з е й Вікенцій Іосіфавіч; 1886, паводле інш. звестак 1891, в. Губы Вілейскага р-на — канец 1916), беларускі пісьменнік. Скончыў Маладзечанскую настаўніцкую семінарыю (1905), Віленскі настаўніцкі ін-т (1910). Працаваў у гар. вучылішчах Вільні і Вілейкі. Загінуў у 1-ю сусв. вайну. У 1909 надрукаваў апавяданне «Пустэльнік у свеце», вытрыманае ў духу рэліг. павучання, і сац.-быт. драму «Не розумам сцяміў, а сэрцам», прасякнутую матывамі грамадзянскай справядлівасці. П'еса была вельмі папулярнай, часта ставілася аматарскімі тэатрамі Зах. Беларусі.

*Тв.*: Не розумам сцяміў, а сэрцам // Беларуская дакастрычніцкая драматургія. Мінск, 1978.

*Літ.*: К а х а н о ў с к і Г.А. Адчыніся, таямніца часу. Мінск, 1984.

**ВЯСЛÓ**, 1) лопасць з доўгім дзяржаннем, прызначаная для веславання (прасоўвання лодкі на вадзе). 2) Нізка аднародных прадметаў.

**«ВЯСНÁ»**, штомесячны літаратурны дадатак да газеты «Камуніст» (г. Бабруйск). Выдаваўся ў 1928—32 (з № 6 за 1931 пад назвай «Ударнік»). Выйшла 39 нумароў (апошнія №№ 1—2 за студз.—люты 1932). На старонках «В.» публікавалі свае творы члены бабруйскіх акруговых філіялаў «Маладняка» і Бел. асацыяцыі пралетарскіх пісьменнікаў, маладыя пісьменнікі: празаікі Д.Абакшонак, Р.Бахта, Х.Бужан, А.Жукоўскі, М.Мікіцін, Б.Мікуліч, К.Уласюк (К.Антановіч), Х.Явар (Х.Шынклер), паэты А.Атава (А.Канановіч), Я.Валасевіч, С.Грахоўскі, А.Жаўрук, А.Зарыцкі, Я.Кохан, Ц.Крысько (В.Вітка), Я.Сукала, Р.Суніца (Р.Лынькоў), А.Сячко, А.Чымбур і інш. Друкавала артыкулы і рэцэнзіі, хроніку літ. жыцця Бабруйшчыны. Рэдактар дадатка М.Лынькоў (да № 1 за 1931).

**ВЯСНЯ́НКА**, жылы раён у Мінску. Забудоўваецца з 1985 (архіт. Я.Сап'янік, Г.Белікаў, В.Анікін, Л.Красіева, В.Пушкін, В.Крусь, С.Замараеў, Ю.Іваноў). Размешчаны ў паўн.-зах. часткі горада на міжмагістральнай тэр. (пл. 51 га) паміж вул. Ціміразева і пр-там Пераможцаў. Разлічаны на 24 тыс. жыхароў. Кампазіцыя забудовы запраектавана з улікам блізкасці паркавай зоны ў даліне р. Свіслач. Жылыя будынкі (9—12-павярховыя дамы) у цэнтр., найб. узвышаным участку тэр., утвараюць маляўнічы ступеньчаты сілуэт, акцэнтам якога з'яўляецца група 20-павярховых дамоў. У В., якая мае аўтаномнае размяшчэнне, прадугледжаны розныя віды абслугоўвання. У цэнтр. частцы забудовы (пр-т Пераможцаў) знаходзіцца комплексны гандлёва-грамадскі цэнтр з паліклінікай, «Белаграпрамбанкам», гандлёвым цэнтрам «Вяснянка» і інш. Аб'екты гандлёва-быт. абслугоўвання размешчаны па перыметры раёна. Асн. пешаходныя шляхі вядуць у зону грамадскага цэнтра, да футбольнага манежа, спарт.-аздараўленчага цэнтра і лыжна-ролернай трасы. У 2007 у В. здадзены 8-павярховы гасцінічны комплекс «Вікторыя», у 2009 адкрыты шматпрофільны культ.-спарт. комплекс міжнар. ўзроўню *«Мінск-Арэна»*.

**ВЯСНЯ́НКІ**, песні-заклічкі, загуканні, прысвечаныя абраду *Гукання вясны*. Выконваюцца ва ўмовах натуральнага асяроддзя (на пратталінах, пагорках, берагах рэк і азёр, гуменных стрэхах і інш.), скіраваны на магічнае загуканне прыходу вясны, што вызначае асаблівасці выканання (спевы па чарзе, ужыванне выклічнікаў «гу», «у», «агу», «ге», «у-у-у!» і інш.). У В. прасочваецца культ ураджаю (гуканне вясны з караваем на Петрыкаўшчыне), культ птушак, вестуноў вясны (заклікі з падкідваннем угору выпечаных з цеста жаваронкаў, кулікоў, жаўрукоў у в. Ланская Маларыцкага р-на і на Століншчыне), культ раслін (з песняй вешалі вянок з барвянка на бярозу ў Тураве і Лельчыцах), культ роду (пыталіся: «Ці дазволіце, старыя людзі, вясну загукаці?») і інш. Форма і ўмовы выканання В. нарадзілі дыялогі, у якіх праступае абрадава-магічная аснова, матывы замыкання зімы і адмыкання лета («Благаславі, Божа, на ўзгорку сесці, вясну загукаці, лецечка адмыкаці, зіму замыкаці»).

У В. вясна паўстае прыгожай дзяўчынай, якая прыносіць кожнаму падарунак ці пачастунак:

Старым дзядочкам па кіёчачку,
Ой, люлі, люлі, што із вербачкі.
Старым бабачкам па маточачцы,
Ой, люлі, люлі, што зімой пралі.
Усім хлопчыкам ды па дудачцы,
Ой, люлі, люлі, што із вербачкі.
Усім дзевачкам ды па стужачцы,
Ой, люлі, люлі, заплятаць косы.
Усім дзетачкам па яечачку,
Ой, люлі, люлі, шчэй па булачцы.

У некаторых творах выступае распарадчыкам прац. абавязкаў («маладым мужчынкам поле араць», «ма-



*Гасцінічны комплекс «Вікторыя» ў жылым раёне* ***Вяснянка***.

лодкам палотна бяліць», «старым дзядкам на мураўцы сядзець» і інш.).

Сучаснае бытаванне В. паступова нівеліруе практычную (магічную) функцыю, на першае месца выступае маст. эстэтычная. Многія творы адарваліся ад абраду, працягваюць існаванне ў канкрэтнай інтэрпрэтацыі, спяваюцца ў закрытым памяшканні, набываюць другасныя формы выкарыстання. У сувязі з адсутнасцю непасрэднага кантакта з прыродай, знікаюць муз. інтанацыі воклічу, забываецца спецыфіка антыфоннай нар. манеры спеваў. Сёння выканаўцы амаль не валодаюць навыкамі і прыёмамі спеваў на адкрытай прасторы.

*Літ.*: Можейко З.Я. Календарно-песенная культура Белоруссии. Минск, 1985; Аляхновіч А.М. Беларуская традыцыйная музычная спадчына. Мінск, 2000. *А.М.Аляхновіч.*



***Вятрак** у Беларускім дзяржаўным музеі народнай архітэктуры і побыту.*

**ВЯТРАК**, ветраны млын, вытворчая пабудова для памолу зерня, у якой выкарыстоўваецца энергія ветру. У аснове канструкцыі передача з дапамогай зубчастых колаў вярчальнага моманту ад умацаваных на гарызантальным вале крылаў (звычайна 4) на вертыкальны вал, а затым на верхнія каменні паставаў. В. будавалі на адкрытых прасторах, што рабіла іх выразнымі акцэнтамі навакольнага асяроддзя. У Беларусі пераважна драўляныя В. з'явіліся каля 12 ст. У 18 — пач. 20 ст. будавалі В. стрыжнёвыя (казловыя, слупавыя) і шатровыя (галандскія). Стрыжнёвыя (выш. 8—10 м) мелі квадратны ў плане каркасны корпус, абшыты дошкамі ці гонтай, які паварочваўся супраць ветру вакол восевага слупа, умацаванага на спец. канструкцыі — «козлах» (вёскі Даматканавічы Клецкага, Адэльск Гродзенскага р-наў). Шатровыя (выш. да 18 м) з 8-гранным нахіленым каркасным корпусам стаялі на зрубе з 4—5 вянкоў і былі абшыты дошкамі. Адносна ветру з дапамогай «дышляў» па коле, якім завяршаўся корпус, паварочвалі толькі верхнюю частку — «шапку» з крыламі (вёскі Зелянец Хоцімскага, Бярозаўка Кармянскага р-наў). У канцы 19 — пач. 20 ст. на Пн Беларусі з'явіліся невял. В. (выш. 2—4 м). Вядомы В., якія перавозілі на колах (в. Рацькі Шаркаўшчынскага р-на) і ўбудоўвалі ў хату (в. Латышы Міёрскага р-на), а таксама прамежкавы тып: каркасны корпус паварочваўся на вял. коле, усталяваным на каменным фундаменце (в. Янушаўка Мядзельскага р-на). Сёння В. можна ўбачыць у *Беларускім дзяржаўным музеі народнай архітэктуры і побыту*, музейным комплексе *«Дудуткі»*, культ.-забаўляльным комплексе *«Карчма»* каля г. Магілёў, фермерскай гаспадарцы каля в. Мольча Светлагорскага р-на.



***Вятрак** у фермерскай гаспадарцы каля в. Мольча Светлагорскага р-на.*

*Літ.*: Локотко А.И. Белорусское народное зодчество. Минск, 1991; Сергачев С. Ветряные мельницы в Беларуси // Архитектура и строительство. 2006. № 3. *С.А.Сергачоў.*

**ВЯЧОРКІ**, Вечарынкі, Засідкі, Попрадкі, Наначкі, Шаровак, звычай вясковага люду збірацца вечарамі. Звязаны з язычніцкімі ігрышчамі. Першапачаткова В. праводзіліся на вольным паветры ў час свят, звязаных з сонцастаяннем і раўнадзенствам. Пазней былі перанесены ў памяшканні (корчмы, сялянскія хаты і інш.).